DOCENDO DISCIMUS MCMX

# МЫ і ЧАС

№ 5 (287)
ПЯТНІЦА,
17 САКАВІКА
2017 ГОДА

ГАЗЕТА ВДУ ІМЯ П.М. МАШЭРАВА

# У БУДУЧЫНЮ — З ВДУ!










Для многіх абітурыентаў знаёмства з найстарэйшай навучальнай установай Прыдзвінскага краю – ВДУ імя П.М. Машэрава пачынаецца завочна на ўроках у школах, дзе працуюць выпускнікі нашай альма-матар. Гэта яны расказваюць сваім выхаванцам пра ўніверсітэт, яго традыцыі, выкладчыкаў, цікавае студэнцкае жыццё. Бліжэй жа пазнаёміцца з нашай ВНУ, сустрэцца з дэканамі і атрымаць дакладную інфармацыю пра факультэты і спецыяльнасці хлопцы і дзяўчаты могуць падчас дзён адчыненых дзвярэй, што праходзяць у нашым універсітэце дзякуючы супрацоўнікам падрыхтоўчага аддзялення (загадчык Лілія Львоўна Алізарчык). Не стаў выключэннем дзень адчыненых дзвярэй і 25 лютага бягучага года.

Мерапрыемства пачалося а дзясятай гадзіне, калі ў фае галоўнага корпуса ВДУ імя П.М. Машэрава пачалі збірацца будучыя абітурыенты. Прадстаўнікі факультэтаў і супрацоўнікі падрыхтоўчага аддзялення ледзь паспявалі рэгістраваць гасцей, адказваць на шматлікія пытанні юнакоў і дзяўчат, іх бацькоў, дзядуляў і бабуль ды раздаваць буклеты і ўніверсітэцкую газету «Мы і час», у якой змешчана падрабязная інфармацыя пра кожны факультэт.

Гледзячы на гэты бясконцы жывы ручаёк, кіраўнікі факультэтаў, думаю, шчыра радаваліся: ім будзе каго вучыць і каму перадаваць свой прафесійны і жыццёвы вопыт. Некаторыя ж школьнікі, бачачы чэргі, адразу, без рэгістрацыі, забягалі ў актавую залу, дзе вось-вось павінна была адбыцца сустрэча з адміністрацыяй ВНУ, а трошкі пазней і з дэканамі факультэтаў. І калі Л.Л. Алізарчык, павітаўшыся з будучымі студэнтамі і пазнаёміўшы іх з праграмай дня адчыненых дзвярэй, пачала расказваць пра падрыхтоўчыя курсы, у залу яшчэ заходзілі і заходзілі сённяшнія школьнікі – такія непасрэдныя ды сціплыя. Менавіта такімі яны мне падаліся, калі я размаўляла з імі.

Так, Марына Калбека і яе сястра Кацярына пра наш універсітэт даведаліся ад сваіх настаўнікаў. Кацярына плануе паступаць на юрыдычны факультэт, а Марына – на біялагічны. Вучыцца на апошнім марыць і Маргарыта Навікава. Дзяўчына любіць прыроду і жывёл. Яна шмат ведае пра нашу ВНУ, з задавальненнем наведвае сайт, цікавіцца ўсім, чым жыве ВДУ імя П.М. Машэрава. Ілона Дзімітка на дзень адчыненых дзвярэй прыехала з бацькамі з Глыбоцкага раёна. Дзяўчына скончыла мастацкую школу і сёння не ўяўляе свайго жыцця без мастацтва, таму марыць вучыцца на мастацка-графічным факультэце.

У гэты дзень ва ўніверсітэце шмат было школьнікаў выпускных класаў, дзевяцікласнікаў і дзесяцікласнікаў з віцебскіх школ і гімназій. Настаўніца вышэйшай катэгорыі А.М. Навіцкая, якая выкладае рускую мову і літаратуру ў гімназіі № 6 г. Віцебска, прывяла ў нашу альма-матар свой любімы 11 «А» клас. Алена Мікалаеўна скончыла нашу ВНУ (у той час – Віцебскі дзяржаўны педагагічны інстытут імя С.М. Кірава). Яе выхаванцы ўжо вызначыліся з факультэтамі: адны збіраюцца паступаць на філалагічны, другія – на біялагічны і юрыдычны, трэція – на факультэт матэматыкі і інфармацыйных тэхналогій.

Дарэчы, падчас размовы з настаўнікамі высветлілася, што ўсе яны прытрымліваюцца адной думкі: факультэт трэба выбіраць загадзя і ў выпускным класе з усёй сур'ёзнасцю рыхтавацца да тэстаў і ўнутрыўніверсітэцкіх іспытаў. Што ж, слушная парада будучым абітурыентам.

Прыемна, што школьнікам і іх бацькам спадабалася мерапрыемства. Задаволенымі засталіся і супрацоўнікі падрыхтоўчага аддзялення, бо ў гэты дзень у ВДУ імя П.М. Машэрава завітала больш за 300 чалавек з адзінаццаці раёнаў Віцебскай вобласці і горада Мінска.

– Дзень адчыненых дзвярэй прайшоў прадуктыўна, – дзеліцца ўражаннямі Л.Л. Алізарчык. – Усе запланаваныя мерапрыемствы былі праведзены. Аднак на гэтым дзейнасць падрыхтоўчага аддзялення не спыняецца: яго супрацоўнікі будуць прымаць удзел у раённых злётах выпускнікоў, арганізоўваць кансультацыі па прадметах ЦТ. Мяркуем правесці прадметную алімпіяду для абітурыентаў, рэгулярна сустракацца з выпускнікамі сярэдніх школ і гімназій горада Віцебска. У планах – правядзенне трэніровачнага тэсціравання, арганізацыя экспрэс-курсаў для падрыхтоўкі да ЦТ. Разнастайныя прафарыентацыйныя мерапрыемствы будзем ладзіць падчас рэгістрацыі на ЦТ.

Сапраўды, наперадзе ў супрацоўнікаў падрыхтоўчага аддзялення працы шмат. Але, гледзячы на тое, з якой адказнасцю і зацікаўленасцю яны праводзяць прафарыентацыйную работу, можна з упэўненасцю сказаць, што ў ВДУ імя П.М. Машэрава не будзе праблем з наборам абітурыентаў.

**Настасся ЛАЗЕБНАЯ.**

**На здымках:** падчас дня адчыненых дзвярэй.

**Фота аўтара.**

**КОРАТКА ПРА РОЗНАЕ**

## ДЗЕНЬ ЗА ДНЁМ

7 сакавіка ў нашым універсітэце адбылася VI справаздачна-выбарчая канферэнцыя пярвічнай арганізацыі грамадскага аб'яднання «Беларускі рэспубліканскі саюз моладзі» ўстановы адукацыі «Віцебскі дзяржаўны ўніверсітэт імя П.М. Машэрава» з правамі раённага камітэта.

На парадку дня было пяць пытанняў. Выконваючы абавязкі першага сакратара Уладзіслаў Цітоў расказаў пра дзейнасць БРСМ нашай ВНУ, а таксама пра выбранне камітэта, кантрольнай камісіі і дэлегатаў на XXXV справаздачна-выбарчую канферэнцыю Першамайскай раённай арганізацыі ГА «БРСМ» горада Віцебска.

Акрамя таго, быў прыняты зварот дэлегатаў да студэнтаў нашага ўніверсітэта, у якім зазначалася, што БРСМ – гэта грамадская маладзёжная арганізацыя, асноўная мэта якой – стварыць умовы для ўсебаковага развіцця моладзі і раскрыцця яе творчага патэнцыялу. Саюз моладзі зарэкамендаваў сябе канкрэтнымі справамі і заваяваў аўтарытэт не толькі ў асяродку студэнтаў, але і ў грамадстве ў цэлым.

Падчас канферэнцыі былі выбраны камітэт з 11 чалавек, кантрольная камісія ў складзе 3 чалавек і 36 дэлегатаў, якія будуць прадстаўляць БРСМ нашага ўніверсітэта на раённай канферэнцыі.

***

Дэпутат Палаты прадстаўнікоў (Віцебская-Горкаўская выбарчая акруга) Таццяна Старынская напрыканцы лютага стала госцем факультэта сацыяльнай педагогікі і псіхалогіі. Таццяна Аляксандраўна сустрэлася з прафесарска-выкладчыцкім складам кафедр практычнай псіхалогіі і сацыяльна-педагагічнай работы. У размове з выкладчыкамі факультэта дэпутат расказала пра змены ў пенсійнай рэформе Беларусі і прывяла прыклады з рэальнай практыкі выкарыстання некаторых норм пенсійнага заканадаўства. Таццяна Старынская напрысутнічала таксама на цырымоніі ўручэння выпускнікам дыпломаў аб вышэйшай адукацыі і павіншавала іх з гэтым святочным днём.

***

Напрыканцы лютага на факультэце сацыяльнай педагогікі і псіхалогіі адбылося ўзнагароджанне ўдзельнікаў валанцёрскага адукацыйнага праекта «Дзеці ў Інтэрнэце», што быў арганізаваны кампаніяй «МТС» пры падтрымцы Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь. Нашыя хлопцы і дзяўчаты за лістапад – снежань правялі ўрокі мабільнай граматнасці ў 43 класах школ Першамайскага раёна горада Віцебска. Прамежкавыя вынікі падвёў дырэктар Віцебскага філіяла МТС У.У. Андрэйчанка, які ўручыў 39 сертыфікатаў удзельнікам-валанцёрам ФСПіП. А студэнткі 5 курса Анастасія Малахава і Наталля Тараканава атрымалі за актыўны ўдзел і крэатыўны падыход ад кампаніі каштоўныя прызы.

***

Спартландыя «А ну-ка, парни!» прайшла ў нашым універсітэце ў Дзень абаронцаў Айчыны. У спаборніцтве прынялі ўдзел хлопцы, якія пражываюць у інтэрнатах № 3, № 4 і № 5. Арганізавалі і правялі спартландыю інструктары спартыўнага клуба нашага ўніверсітэта (кіраўнік Алег Галавінец): Ганна Шарстнёва, Андрэй Серабракоў, Пётр Яско і Аляксандр Батуркін. У выніку напружанай барацьбы першае месца занялі студэнты з Туркменістана, якія пражываюць у інтэрнаце № 4, другое – студэнты-туркмены з інтэрната № 5, трэцімі сталі беларускія хлопцы з інтэрната № 3.

***

Каманда туркменскіх хлопцаў нашага ўніверсітэта годна выступіла на турніры па валейболе сярод туркменскіх студэнтаў устаноў вышэйшай адукацыі Рэспублікі Беларусь, што праходзіў у сярэдзіне лютага на базе Гомельскага дзяржаўнага тэхнічнага ўніверсітэта. У турніры прынялі ўдзел студэнты з Мінска, Віцебска, Гродна, Гомеля і іншых гарадоў. А перамогу святкавалі туркменскія студэнты ВДУ імя П.М. Машэрава.

**ТРАДИЦИЯ**

# НЕДЕЛЯ ПАМЯТИ П.М. МАШЕРОВА

С 13 по 17 февраля в нашем университете и за его пределами проходила Неделя памяти П.М. Машерова.

Открыла неделю заведующий мемориальной комнатой-музеем П.М. Машерова, методист отдела по воспитательной работе с молодежью нашего университета Ольга Владимировна Путеева. Вниманию студентов была представлена мультимедийная композиция «Лидер эпохи», посвященная жизни Петра Мироновича сквозь призму сегодняшнего дня. Среди присутствующих были студенты факультета математики и информационных технологий во главе с заместителем декана по воспитательной работе Андреем Павловичем Меховичем, юноши и девушки юридического и филологического факультетов. На открытии присутствовал и автор одного из бюстов П.М. Машерова – скульптор, доцент кафедры изобразительного искусства ХГФ Иван Иванович Колодовский. Помимо этого, дан был старт историко-патриотической акции «100 шагов памяти» к 100-летию П.М. Машерова, которое будет праздноваться в следующем году.



В этот же день состоялось возложение цветов к бюсту и мемориальной доске П.М. Машерову председателями профкомов работающих и студентов Дмитрием Олеговичем Стриком и Алексеем Николаевичем Трубиным, а также студентами университета.

На протяжении Недели памяти П.М. Машерова в нашей альма-матер проходили и другие интересные и познавательные мероприятия. Одно из наиболее запомнившихся ребятам – квест «Витебск 30-х годов», в котором приняли участие команды юридического факультета и факультета математики и информационных технологий. Отвечая на различные вопросы, студенты пытались воспроизвести образ Витебска того времени, когда здесь жил и учился П.М. Машеров.



16 февраля состоялась международная квест-игра «Партизанскими тропами». Она была организована в Россонах на базе Музея боевого содружества. В ней приняли участие студенты факультета обучения иностранных граждан из Туркменистана и сотрудники Россонского МЧС. Команды выполняли боевые задания, решали логические задачи, а также сооружали плот. Ведь именно с помощью плота партизаны во время Великой Отечественной войны успешно завершили Бениславскую диверсию.

В этот же день в студенческих группах нашего университета прошли тематические кураторские часы, посвященные жизни и деятельности Петра Мироновича.

**P.S.** Администрация ВГУ имени П.М. Машерова выражает благодарность организаторам Недели памяти П.М. Машерова, а также отделу идеологической работы, культуры и по делам молодежи Россонского райисполкома и Музею боевого содружества за постоянное сотрудничество, а также приглашает всех желающих принять участие в стартовавшей акции «100 шагов памяти», которая будет проходить на протяжении всего года.

**Вера ЛАБЗОВА,**
**студентка 3 курса ФлФ.**

**ДАТА**

# «ЭХО АФГАНИСТАНА»

15 лютага ў актавай зале Віцебскага дзяржаўнага каледжа культуры і мастацтваў не было вольных месцаў. На падвядзенне вынікаў конкурсу тэматычнай сацыяльнай рэкламы сярод студэнтаў і навучэнцаў «Эхо Афганистана», прысвечанага 28-й гадавіне з дня вываду савецкіх войскаў з Афганістана, сабраліся прадстаўнікі грамадскіх арганізацый і аб'яднанняў, ветэраны-афганцы.

На пачатку мерапрыемства да прысутных звярнуўся намеснік старшыні гарвыканкама Пётр Падгурскі, які адзначыў важнасць такога кшталту конкурсаў для патрыятычнага выхавання дзяцей і моладзі. Пётр Мікалаевіч прызнаўся, што членам журы было няпроста вызначыць пераможцаў, бо кожны канкурсант, ствараючы сацыяльны відэаролік, аўтарскі макет банера ці білборда, уклаў часцінку сваёй душы.

Затым пачалося ўзнагароджанне пераможцаў. Трэцяе месца ў намінацыі «Аўторскій макет билборда» заняў студэнт ВДМУ Уладзімір Міронаў, другое месца ў ваеннаслужачага 103-й асобнай гвардзейскай паветрана-дэсантнай брыгады Вадзіма Майзінгера. Дыпламам І ступені ўзнагароджана студэнтка нашага ўніверсітэта Вікторыя Гурская за работу «Афганистан – незаживающая рана». Дарэчы, Віка на днях атрымала яшчэ адзін дыплом – аб заканчэнні факультэта сацыяльнай педагогікі і псіхалогіі ВДУ імя П.М. Машэрава.

Трэба адзначыць, што ў межах конкурсу тэматычнай сацыяльнай рэкламы прайшоў конкурс дзіцячага малюнка, у якім прынялі ўдзел 120 школьнікаў. Лепшым з юных мастакоў таксама былі ўручаны дыпломы.

Павіншаваць пераможцаў прыйшлі дэпутаты Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Таццяна Старынская, Сяргей Занько і Аляксандр Цацоха, член Савета Рэспублікі Нацыянальнага сходу Рэспублікі Беларусь Алена Панцюхова, начальнік аддзела ідэалагічнай работы, культуры і па справах моладзі гарвыканкама Наталля Шыёнак.

**УЛАСНАЯ ІНФАРМАЦЫЯ.**




**На здымку:** Вікторыя Гурская.

**Фота С. АЛЁШЫНАЙ.**

**P.S.** Штогод у нашай краіне адзначаецца Дзень памяці воінаў-інтэрнацыяналістаў. З гэтай нагоды ў нашым універсітэце тэатральная студыя «Буклерон» падрыхтавала для ўдзельнікаў тых страшных падзей, а таксама для выкладчыкаў і студэнтаў літаратурна-музычную кампазіцыю «3341». Назва яе сімвалічная: менавіта столькі дзён доўжылася вайна. Кампазіцыя нікога не пакінула раўнадушным.

Дарэчы, рэпартаж з вечара-памяці можна паглядзець на сайце нашай ВНУ ў раздзеле «Універсітэцкае тэлебачанне».

**В КОЛЛЕДЖЕ**

# НОВЫЕ ГРАНИ МЕЖДУНАРОДНОГО СОТРУДНИЧЕСТВА

Оршанский колледж нашего университета налаживает связи с польскими вузами. По инициативе директора колледжа А.А. Зулёва, которую поддержали ректор ВГУ имени П.М. Машерова А.В. Егоров и руководство Оршанского райисполкома, на базе колледжа планируется создание центра международного образовательного сотрудничества.

Для этого в октябре прошлого года Оршу посетили представители Высшей школы предпринимательства и управления (г. Люблин), которые на примере колледжа познакомились с системой среднего специального образования в нашей республике. А недавно с ответным визитом в Польшу отправилась делегация Оршанского колледжа, в состав которой вошли преподаватели различных учебных дисциплин.

В формате круглых столов и конференций состоялись деловые встречи с научно-педагогическими работниками, студентами и руководством таких польских вузов, как Варшавский лингвистический институт, Высшая школа предпринимательства и управления, Варшавский университет.

За это время представители колледжа смогли поделиться опытом, в дружеской обстановке обсудить вопросы развития профессионального образования и произошедшие в последнее время глобальные и региональные изменения в национальных образовательных системах. Особый интерес у оршанцев вызвали знакомство с кафедрой белорусистики Варшавского университета, которая готовит специалистов в области белорусского языка, а также общение с представителями Гуманитарно-экономической академии (г. Лодзь).

Для представителей делегации была подготовлена и развлекательная программа. Белорусы побывали в Центре науки «Коперник», в знаменитом Люблинском королевском замке, где в 1569 году была заключена Люблинская уния, в библиотеке Варшавского университета, которая работает круглосуточно, но при этом в учреждении нет ни одного библиотекаря.

Результатом переговоров стало подписание соглашений о сотрудничестве в области образовательной, научной и культурно-общественной деятельности с Варшавским лингвистическим институтом и Высшей школой предпринимательства и управления. Для оршанцев это, в первую очередь, означает возможность обмениваться результатами научно-исследовательской и учебно-воспитательной работы, организовывать стажировки преподавателей и учащихся, реализовывать совместные инновационные проекты.

Кроме того, Анатолий Александрович Зулёв по поручению Оршанского районного исполнительного комитета провел переговоры с руководством мэрии Люблина об установлении побратимских связей между нашими городами. Эта инициатива оршанской стороны вызвала интерес у поляков.

**Н.П. ГРИГОРОВИЧ,**
**председатель цикловой комиссии дошкольного и начального образования.**



**БИОФАК**

# ВРЕМЯ, ПРОВЕДЕННОЕ С ПОЛЬЗОЙ

Традиционная Неделя биологического факультета в этом году стартовала 20 февраля. Для студентов, преподавателей и гостей факультета была предусмотрена насыщенная программа.

Открыл неделю День кафедр географии и ботаники, в рамках которого прошли видеолекция «Удивительный мир растений», экскурсия по научно-исследовательской лаборатории ПЦР-анализа и олимпиада по физической и социально-экономической географии. Кроме этого, студенты могли принять участие в интеллектуальной игре «Географический калейдоскоп» и совершить небольшое заочное путешествие во время встречи с иностранными студентами.

Вторник на биологическом факультете был посвящен кафедре химии и кафедре анатомии и физиологии. На базе последней состоялось методическое объединение учителей медицинской подготовки из учреждений образования Первомайского района нашего города, во время которого были рассмотрены вопросы сотрудничества по внедрению образовательных ресурсов и материально-технической базы нашего университета в учебный процесс витебских школ.

Ответственный за работу с абитуриентами на БФ Александр Николаевич Дударев рассказал об истории факультета, его сегодняшних успехах и достижениях, специальностях и особенностях обучения. Затем гости посетили зоологический музей и познакомились с биоразнообразием Белорусского Поозерья. Запомнился всем и мастер-класс «Обучение оказанию первой помощи при заболеваниях эндокринной системы» для учителей медицинской подготовки и студентов-биологов. Кандидат медицинских наук, доцент кафедры анатомии и физиологии Марьяна Нурмухамедовна Нурбаева рассказала о том, что эндокринная система человека регулирует такие ключевые показатели жизнедеятельности, как пульс, артериальное давление, температура тела, дыхательный ритм. Именно от работы эндокринной системы зависят физическое и психическое самочувствие человека, продолжительность его жизни, качество и длительность сна, работоспособность, настроение, репродуктивная функция и многое другое.

Среда была посвящена кафедре экологии и охраны природы. Студенты и гости познакомились с направлениями научно-исследовательской работы кафедры, а также с работой волонтерской группы общественных экологов «Экологический патруль». Волонтеры БФ тесно сотрудничают с Витебской городской инспекцией природных ресурсов и охраны окружающей среды, с различными организациями и учреждениями образования, участвуют в акциях и общественных мероприятиях и всегда готовы прийти на помощь в деле охраны и защиты окружающей среды. Так, членами «Экологического патруля» был проведен сбор средств для приюта для бездомных животных.

Четверг по традиции на факультете прошел под девизом «Молодежь выбирает здоровье». Студенты-биологи собрались в спортивном зале, чтобы посоревноваться в различных видах спорта и с пользой для здоровья провести время. Кроме этого, в рамках Дня кафедры зоологии в этот день на биофаке прошел кураторский час «Изучение и познание природы», а в холле четвертого этажа открылась выставка творческих работ старшего преподавателя кафедры зоологии Светланы Петровны Кохановской.

Завершила Неделю факультета Масленица, которую из-за плохих погодных условий машеровцы праздновали в спортзале. Зато чучело уходящей зимы сожгли на стадионе. Видимо, старинный славянский ритуал сработал: в Витебске установилась не характерная для начала марта весенняя погода.

Биологи же еще раз доказали, что их факультет – одна большая дружная семья, в которой каждый студент может реализовать себя в учебе, науке, волонтерском движении, культурно-массовой работе и с пользой провести время.

**НАШ КОРР.**



# Е.Ю. МУРАТОВА: «ЕСЛИ ЧЕЛОВЕК ЛЮБИТ СВОЕ ДЕЛО, ОН ВСЕГО ДОБЬЕТСЯ»

***Каждый день посещая занятия, мы, студенты, узнаем много нового. Но нередко случается, что за повседневной суетой перестаем видеть главное: преподаватель – это носитель не только знаний, но и определенного жизненного опыта, помощник в решении задач, не прописанных в академических учебниках. Так, совершенно с иной стороны раскрылась для меня во время нашей беседы доктор филологических наук, доцент кафедры общего и русского языкознания Елена Юрьевна Муратова.***

**– Елена Юрьевна, скажите, пожалуйста, как Вы оказались на филологическом факультете? Ведь учились Вы в Ленинградском институте авиационного приборостроения, а после его окончания преподавали в Витебском политехникуме.**

– Я всегда очень хотела заниматься филологией. Действительно, я окончила ЛИАП, а сюда приехала по распределению на практику, на телевизионный завод. Здесь познакомилась со своим будущим мужем, вышла замуж и решила поступать на заочное отделение филологического факультета. Документы мои сразу не взяли, поскольку у меня уже было одно высшее образование. Когда я на следующий год пришла к ректору, тот сказал: «Хорошо, есть такое положение "на усмотрение администрации". Мы примем у вас документы». На тот момент у меня уже был немалый багаж знаний, а с зимы начала готовиться еще более основательно. То есть, если по билету требовалось рассказать одно стихотворение наизусть, я учила двадцать. Все правила знала хорошо. А когда я пришла поступать, то набрала самый высокий балл среди абитуриентов, и меня приняли.

**– Как скоро Вы поняли, что хотите заниматься наукой?**

– Наверное, во время выполнения первых контрольных работ. Я очень любила анализировать стихотворения, например по литературоведению, и преподаватели ставили мне хорошие оценки и хвалили. Потом появилась первая курсовая работа, и я с огромным удовольствием ее написала, затем – дипломная, научным руководителем которой была Анна Михайловна Мезенко. Именно она мне сказала: «У вас есть способности, и мы хотим, чтобы вы остались в университете».

**– Как сформировался круг Ваших научных интересов?**

– Я занимаюсь лингвопоэтикой, а круг научных интересов у меня сформировался еще в Ленинграде. Помню, как открыла для себя творчество Марины Цветаевой. Мой одногруппник был знаком с врачами, мужем и женой, которые имели эмигрантские журналы из Парижа. В них были опубликованы стихи Цветаевой. Врачи никому не давали журналы на руки. Однажды приятель привел меня к ним, и я всю ночь, сидя на кухне, переписывала ее стихи из этих журналов. С тех пор я буквально заболела Цветаевой, стала узнавать о ней все больше и больше.

**– Что Вам ближе: наука или преподавание?**

– Думаю, и то и другое. Наукой мне очень нравится заниматься, но и без студентов я не могу.

**– Возникают ли у Вас сложности во время подготовки и проведения занятий? Если да, то какие?**

– Определенные сложности естественно появляются. Например, чтобы преподавать студентам ту или иную дисциплину, необходимо написать целый курс лекций. Так, у меня была новая дисциплина, состоящая из 42 часов лекций, и я все лето готовилась. С одной стороны, это очень интересно, с другой – это все-таки трудно. Сложно также, когда очень большая нагрузка. Бывало такое, что у меня в расписании несколько недель подряд по четыре пары в день стояло. Конечно же, я уставала. Но я очень люблю студентов, они молодые, веселые, доброжелательные и многое прощают, если видят, что преподаватель хорошо относится к ним и старается научить их чему-то.

**– Елена Юрьевна, а какими были Ваши студенческие годы?**

– Мои студенческие годы были совершенно замечательные. Я приехала в Ленинград из небольшого шахтерского городка Сланцы, который находится в 140 км от Санкт-Петербурга. Жила я в общежитии в студгородке. Помимо института, сам город дал очень многое. Мы, студенты, посещали театры, филармонии, музеи. В группе ежемесячно назначался человек, который в определенный день занимал очередь в кассу в шесть часов утра (к часам десяти подтягивались остальные ребята), благодаря чему мы на месяц покупали билеты. Я просмотрела все балеты, прослушала все оперы, побывала практически во всех музеях Ленинграда. Да и сама студенческая жизнь тоже была интересной. Когда не хватало денег, мы с подружкой работали на фабрике по выпуску сухих пакетиков с едой. Днем учились, а в ночную смену выходили на работу. Никогда не забуду также хоккейный матч между канадской командой и командой СССР. То, что показано в фильме «Легенда №17», мы лицезрели наяву.

**– Есть ли такие произведения искусства, которые запечатлелись у Вас в глубине души?**

– Конечно же есть, и их можно долго перечислять. Я закончила музыкальную школу, и мне очень многое нравится в музыке. Например, произведения Фредерика Шопена, «Лунная соната» Людвига ван Бетховена. В живописи безмерно люблю импрессионистов, особенно потрясает Винсент Ван Гог: его картины, жизнь, история его брата Теодора, который все время заботился о знаменитом художнике. Из литературы выделяю произведения Михаила Булгакова, самозабвенно люблю «Старосветских помещиков» Николая Гоголя.

**– Чему Вам пришлось научиться и что преодолеть, чтобы стать тем, кем Вы стали?**

– Я не считаю, что стала кем-то особенным, хотя преодолевать приходилось многое. Необходимо было терпение, поскольку у меня возникали сложности с защитой докторской диссертации в России. Мне просто не везло. Изначально у меня были научные публикации по результатам докторской диссертации, но оказалось, что в России их не принимают. На следующий год я написала семь научных работ и опубликовала их в российских изданиях. Однако требования поменялись, и нужно было уже напечатать пятнадцать. Спустя некоторое время, когда я подготовила все публикации, закрыли совет, где я собиралась защищаться. В то время надо было просто не опускать руки и идти к намеченной цели. В марте 2016 года я защитила докторскую диссертацию и на этом деле поставила точку.

**– Что бы Вы хотели пожелать всем студентам?**

– Не ошибиться в своем выборе. Если человек любит свое дело, он всего добьется. Если оно ему не нравится, то ничего не получится. Какой бы ни был мир, какая бы ни была страна, какие бы ни были трудности, каждый должен «копать свою грядку» – честно, добросовестно, с любовью и создавать свой оазис. И пусть кругом пустыня – у тебя свой оазис, который состоит из любви к детям, к мужу, к родителям, к своим друзьям, к своему делу... Вот тогда в этом оазисе тебе будет хорошо. Не стоит отделяться от мира, нужно быть в нем и быть гармоничным.

**Екатерина ГОЛАНОВА,**
**студентка**
**3 курса ФлФ.**

**ДА МІЖНАРОДНАГА ДНЯ РОДНАЙ МОВЫ**

# ШКОЛА – ВНУ: ПРАЦУЕМ РАЗАМ




Чаргове адкрытае пасяджэнне студэнцкага навуковага гуртка «Мова ў кантэксце культуры» прайшло на філалагічным факультэце напрыканцы лютага. Нагодай для сустрэчы стаў Міжнародны дзень роднай мовы, які шырока адзначаецца ва ўсім свеце. Гасцямі пасяджэння сталі навучэнцы 9-х, 10-х і 11-х класаў сярэдняй школы № 4 г. Віцебска разам з настаўніцай беларускай мовы і літаратуры Вольгай Сцяпанаўнай Зязюлькінай.

У прывітальным слове кіраўнік гуртка – загадчык кафедры беларускага мовазнаўства Генадзь Антонавіч Арцямёнак распавёў пра факультэт, спецыяльнасці, на якіх можна вучыцца, адказаў будучым абітурыентам на іх пытанні, што датычыліся ўмоў паступлення на ФлФ і падрыхтоўкі да цэнтралізаванага тэсціравання.

Працягнула размову з гасцямі дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства Алена Сяргееўна Дзядова, якая загадвае філіялам кафедры на базе школы № 4. Яна паведаміла, што, дзякуючы цеснаму супрацоўніцтву школы і ВНУ, старшакласнікі становяцца пераможцамі конкурсаў навуковых прац і раённых прадметных алімпіяд. А некаторыя з навучэнцаў прымаюць рашэнне паступаць у наш універсітэт, што яшчэ раз пацвярджае неабходнасць існавання філіяла.

Аўтар дадзенага матэрыяла расказала пра гісторыю свята, а таксама пра імкненне сусветнай супольнасці захаваць моўную разнастайнасць на планеце, бо кожная нацыянальная мова – гэта не толькі скарб аднаго народа, але і ўсяго чалавецтва.

Затым прысутныя ўдзельнічалі ў віктарынах: называлі аўтараў знакамітых цытат пра родную мову, працавалі з беларускай лексікай, успаміналі любімыя родныя словы (большасць удзельнікаў назвала слова «дранікі»).

Падчас сустрэчы ўзгадалі, што сёлета ў студзені споўнілася 125 год з дня нараджэння Браніслава Тарашкевіча – стваральніка першай «Беларускай граматыкі для школ» (1918), якая мела істотнае значэнне для развіцця і нармалізацыі беларускай мовы. Пра асобу Браніслава Адамавіча і яго трагічны лёс прысутныя даведаліся ўпершыню. Мы ж пажадаем маладым людзям новых ведаў і адкрыццяў на светлым шляху да навукі!

**Кацярына ПІВАВАР,**
**староста гуртка.**

# НАША МОВА БУДЗЕ ЖЫЦЬ

У кожнага чалавека ёсць свая родная мова. Для сапраўднага беларуса яна беларуская. Менавіта пра гэта гаварылі падчас імпрэзы «Свята роднай мовы» ў Віцебскай абласной бібліятэцы 22 лютага. Арганізавалі мерапрыемства супрацоўнікі бібліятэкі і Віцебская абласная рада Таварыства беларускай мовы імя Францішка Скарыны.

Мне і маім сяброўкам Дашы Андрыца і Лізе Ежгуровай пашчасціла прымаць удзел у гэтым свяце. Мы чыталі на памяць любімыя вершы беларускіх класікаў і слухалі нашых сучаснікаў – віцебскіх творцаў Міхася Мірановіча, Мар'яна Даргеля, Людмілу Сіманёнак. Але галоўнай падзеяй вечара стала напісанне X Агульнанацыянальнай дыктоўкі. Старшыня Віцебскай абласной арганізацыі ТБМ, дацэнт кафедры беларускага мовазнаўства нашага ўніверсітэта Юрый Бабіч прапанаваў урывак з апавядання «Усмешка» сёлетняга юбіляра Янкі Брыля. Напрыканцы імпрэзы з музычным нумарам выступіў дуэт Аліны Таргунакавай і Генадзя Емяльянава.

Свята ў бібліятэцы сабрала сапраўдных аматараў беларускай мовы. І гэта цудоўна, калі людзі прыходзяць на такія мерапрыемствы, дзе можна адпачыць душой. А я ў чарговы раз упэўнілася ў тым, што наша мова будзе жыць.

**Крысціна ДАЙЛІДЗЁНАК,**
**студэнтка 3 курса ФлФ.**

# РУСКА-БЕЛАРУСКІ РАЗМОЎНІК ДЛЯ СТУДЭНТАЎ

Сёння беларускую мову ў нашым універсітэце, на жаль, пачуеш нячаста. Хіба толькі выкладчыкі ды студэнты, якія навучаюцца па спецыяльнасці «Беларуская філалогія», выкарыстоўваюць яе ў паўсядзённым жыцці.

З мэтай папулярызацыі роднай мовы супрацоўнікі аддзела студэнцкай творчасці і культурна-забаўляльнай дзейнасці штогод стараюцца да Міжнароднага дня роднай мовы падрыхтаваць цікавае і пазнавальнае мерапрыемства. Сёлета, напрыклад, вырашылі скласці руска-беларускі размоўнік і раздаць яго ўсім ахвотным у фае галоўнага корпуса. Для гэтага яны ўзялі найбольш распаўсюджаныя сяроды студэнтаў выразы, кшталту «дазвольце ўвайсці», «прабачце, я спазніўся» і інш.



Размоўнікам зацікавіліся не толькі беларусы, але і туркменскія хлопцы і дзяўчаты, якія з задавальненнем стараліся вымавіць беларускія словы і абяцалі карыстацца імі ў паўсядзённым жыцці.

**На здымку:** студэнты знаёмяцца з руска-беларускім размоўнікам.

**Фота В. ЛУЗГІНОЙ.**

КАК ЖИВЕШЬ, ФАКУЛЬТЕТ?

# НЕДЕЛЯ КРЕАТИВА НА ХУДГРАФЕ

Неделя дизайна на художественно-графическом факультете стала уже традиционной и проходила в этом году в третий раз. Желающих представить свои проекты на конкурс было очень много (всего около 400 работ). Своеобразный смотр достижений юных дизайнеров открыли представители объемного дизайна на одноименной выставке в выставочном зале факультета. Среди многих удивительных экспонатов наибольшее внимание привлекали разнообразные светильники. С интересом были восприняты лекции-презентации ведущего специалиста компании «GLASPOINT» Александра Мордвинова (г. Заславль) «Стеклодизайн в жилых и общественных помещениях» и студентки третьего курса Натальи Дагиль «Фитодизайн в интерьере». На первом этаже радовали глаз сувенирные изделия.

В День графического дизайна можно было увидеть практический перформанс «Арт-причеська, визаж, боди-арт» в исполнении Анны Кокевко, Ольги Коваленко, Даны Антонович, Евгении Бекишевой. На выставке, развернутой на втором этаже, были представлены портретный фотопроект Александра Овчинникова и Дианы Рожковой, графические стили разных банков, дизайн афиш, открыток, плакатов, цифровое искусство. Много посетителей пришло на презентацию авторских упаковок «Дизайн упаковки». Каких только упаковок здесь не было: для блинчиков, салатов, суши, чая, книг, CD-дисков и т.д. В холле третьего этажа открылась выставка цифровых фотографий Семёна Шевцова «Мой ноябрь». Автор выставки отмечает: «У каждого месяца свой образ, краски и мелодия. У каждого месяца своя неповторимая жизнь. И каждый из нас видит его по-своему». Именно так, по-своему и креативно, представляет он разные пейзажи и портреты, сделанные в Беларуси и России.

Во время презентации мультимедийного дизайна все желающие могли посмотреть видеоролик «Анимация в дизайне» и оценить интерьеры своего факультета, отеля, ресторана, музеев разных знаменитостей (Ле Корбюзье, Коко Шанель, Юрий Гагарин, Филипп Старк, Энди Уорхол), средневековой Франции, экомодерна. В этом учебном году на факультете работает факультатив по двухмерной анимации и мультипликации «Графический чайок». Участники этого творческого объединения презентовали свои первые работы. А гостями дня стали представители международного фестиваля короткометражных фильмов из Минска.

С разными видами дизайна предметно-пространственной среды можно было познакомиться в выставочном зале. А в актовом зале состоялись лекции-презентации Андрея Бедунько (г. Минск) «Энергоэффективные технологии в строительстве» и представителей арт-студии «Zrobym» (г. Минск). Последние поделились опытом, какие сайты и программы лучше использовать при подготовке визуализации, планов привязки электрооборудования и перепланировки квартиры, а также многими другими нюансами при разработке проектов дизайна разных объектов. А выставка проектов этой студии была развернута в выставочном зале «Арт-пространство на Толстого, 7».

Десятилетию кафедры дизайна был посвящен проект «Свои». В этот день состоялись выставки и презентации работ выпускников разных лет, встречи с преподавателями и сотрудниками факультета.

Заключительным аккордом этого масштабного мероприятия стала большая выставка лучших студенческих работ в выставочном зале «Музыкальная гостиная» на проспекте Фрунзе,11. В день ее открытия были подведены итоги Недели дизайна ХГФ-2017 и состоялось награждение победителей. Все выступающие во главе с деканом факультета Ю.П. Бежанарь отметили большую организационную и творческую работу координатора всех проектов – преподавателя кафедры дизайна К.В. Зенькової. Проведенный смотр работ юных дизайнеров позволил многим из них преодолеть иногда имеющуюся некоторую нерешительность, а нам всем показать, что современный дизайн стал неотъемлемой частью нашей повседневной жизни.

**Фёдор ШКИРАНДО.**

**На снимках:** во время Недели дизайна.





ЭНЕРГОНАДЗОР ПРЕДУПРЕЖДАЕТ

# БУДЬТЕ ОСТОРОЖНЫ!

В период весеннего половодья особое внимание уделяется соблюдению правил электробезопасности вблизи электросетевых объектов: линий электропередачи (ЛЭП), трансформаторных подстанций, распределительных устройств. Поскольку весенний паводок может вызвать различные повреждения электрооборудования (в результате подтопления электроустановок), последние, в свою очередь, таят угрозу в виде высокого напряжения.

Витебское МрО филиала «Энергонадзор» РУП «Витебскэнерго» напоминает об основных правилах электробезопасности в паводковый период:

- нельзя приближаться к оборванному проводу ближе 8 метров, проникать в действующие электроустановки и самовольно включать и выключать оборудование;
- категорически запрещается находиться около линий электропередачи или трансформаторных подстанций, оказавшихся в зоне подтопления, ловить рыбу в охранных зонах ЛЭП (это смертельно опасно для жизни!);
- запрещается устраивать спортивные и детские игровые площадки вблизи подстанций и воздушных линий;
- находясь рядом с подстанциями, обращайте внимание на недопустимость присутствия посторонних лиц на территории энергообъектов.

В случае обнаружения электроустановок, оказавшихся в зоне подтопления, незакрытых или поврежденных дверей трансформаторных подстанций или электрических щитов, обрыва проводов, искрения, повреждения опор, изоляторов необходимо сообщить дежурным диспетчерам районов электрических сетей по телефонам, указанным на трансформаторных подстанциях, а также в МЧС по номеру 101 или в аварийную службу городских электросетей по телефону 113.

**М.В. МЯСНИКОВ,**
**инспектор энергоинспекции**
**Витебского МрО**
**филиала «Энергонадзор».**

СВЯТА

# А МЫ МАСЛЕНКУ ЧАКАЛІ ДЫ БЛІНОЧКІ ВЫПЯКАЛІ

Масленіца – старажытнае славянскае свята, што сімвалізуе сабой развітанне з зімой і адраджэнне плодных сіл зямлі. Дзякуючы ўнікальным традыцыям і рытуалам, якія захаваліся да сённяшняга часу, мы можам святкаваць сустрэчу вясны так, як гэта рабілі нашы продкі – весела ды з гумарам. Менавіта ў такой атмасферы віталі вясну і студэнты нашага ўніверсітэта 30 лютага.

У святкаванні Масленіцы раней я прымала ўдзел толькі ў сваім горадзе Наваполацку, таму наведаць імпрэзу ў ВНУ было для мяне ў навіну. Нягледзячы на шэрае, пахмурнае надвор'е, студэнты розных курсаў сабраліся разам у спартыўнай зале галоўнага корпуса, каб адчуць сапраўдную атмасферу народнага свята і паласавацца смачнымі блінамі, духмяны пах якіх я адчула яшчэ на ўваходзе ў памяшканне.





Надзвычай цікавай была сама праграма свята, у аснове якой – традыцыі і абрады сямі дзён масленічнага тыдня, кожны з якіх мае сваю самабытную назву: панядзелак – «Сустрэча», аўторак – «Зайгрыш», серада – «Ласамка», чацвер – «Разгул», пятніца – «Цешчын вечар», субота – «Залоўчыны вячоркі», нядзеля – «Даравальная». Адкрыў імпрэзу фальклорны калектыў педагагічнага факультэта «Вясёлка» (кіраўнік Ю.С. Сусед-Вілічынская). Падчас мерапрыемства вядоўцы знаёмілі прысутных з асаблівасцямі святкавання Масленіцы, ладзілі народныя танцы, праводзілі разнастайныя вясёлыя конкурсы і гульні.

Апошнія, дарэчы, былі не з лёгкіх, патрабавалі ўважлівасці і спрыту, шпаркасці і кемлівасці. Асабіста мне больш за ўсё спадабалася гульня «Карусель». Даспадобы прыйшліся ўдзельнікам свята і гульні «Тры нагі», «Скокі ў мяшках», «Карагод са сляпым вядучым».



Кульмінацыяй імпрэзы стала спальванне на вуліцы пудзіла зімы. «Гары, гары ясна, каб не пагасла!» – радасна заклікалі ўсе прысутныя, фатаграфаваліся, здымалі відэа, каб запомніць гэтае прыгожае веснавое свята надоўга.

**Алеся ДАЎЖЭНКА,**
**студэнтка 1 курса ФлФ.**
**Фота А. ЛАЗЕБНАЙ.**

**Утерянный студенческий билет, выданный на имя Кирдюка Дениса Игоревича, считать недействительным.**

МЫ і ЧАС
ГАЗЕТА ВДУ ІМЯ П.М. МАШЭРАВА
Газета зарэгістравана ў Міністэрстве інфармацыі 27.10.2009 г. Рэг. № 747.

ГАЗЕТА ЎСТАНОВЫ АДУКАЦЫІ «ВІЦЕБСКІ ДЗЯРЖАЎНЫ ЎНІВЕРСІТЭТ імя П.М. МАШЭРАВА»

Адрас рэдакцыі: 210038, г. Віцебск, Маскоўскі пр-т, 33.
Тэл. 58-97-92. Эл. пошта: gazeta@vsu.by
Газета надрукавана афсетным спосабам
на УПП «Віцебская абласная друкарня».
ЛП 02330/116 ад 27.03.2014 г.
Вул. Шчарбакова-Набярэжная, 4, Віцебск, 210015.
Падпісана да друку 16.03.2017 г. у 16.00. Тыраж 1120.
Аб'ём 1 друк. арк. Зак. 1680.

Аўтары апублікаваных матэрыялаў нясуць адказнасць за падбор і дакладнасць фактаў. Іх меркаванні неабавязкова адлюстроўваюць пункт гледжання рэдакцыі.
Газета выходзіць два разы на месяц.

Галоўны рэдактар
І.М. ПРЫШЧЭПА

Рэдактар
Н.П. ЛАЗЕБНАЯ